Генеральнаму Пракурору Рэспублікі Беларусь
У Сьледчы Камітэт Рэспублікі Беларусь

Грамадзяне рэспублікі Беларусь:
(прозьвішчы, адрасы)

Аб правядзеньні сьледзтва

Просім правесьці сьледчыя дзеяньні ў сувязі з паведамленьнем прэсслужбы Адміністрацыі прэзідэнта аб пу блічным выказваньні А. Р. Лукашэнкі, у якім ён засьведчыў пра стварэньне групы кадравага рэзерву ў колькасьці 850 чалавек, якія надзелены ім пэўнымі паўнамоцтвамі абароны перад законам і валодаюць пэрсанальным імунітэтам. Без асабістага дазволу А. Р. Лукашэнкі “іх нельга затрымліваць, арыштоўваць”. “Гэта важна для таго, каб яны маглі самастойна дзейнічаць”, — патлумачыў А. Р. Лукашэнка.

Дзеяньні А.Р. Лукашэнкі груба парушаюць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, у тым ліку:
- арт 7. У Рэспубліцы Беларусь устанаўліваецца прынцып вяршэнства права. Дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасці з ёю актаў заканадаўства.
- арт.23. (абзац другі) Ніхто не можа карыстацца перавагамі і прывілеямі, якія супярэчаць закону.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (глава 3 раздзела 4) і Закон “Аб Прэзыдэнце Рэспублікі Беларусь” не надзяляюць асобу, якая займае пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, правам надаваць імунітэт недатыяльнасьці асобным грамадзянам або групам грамадзянаў.

Стварэньне антыканстытуцыйнай групы ў мэтах фармаваньня і ўтрыманьня ўлады, незаконнае надзяленьне яе ўдзельнікаў асобымі паўнамоцтвамі, якія выводзяць іх з-пад дзеяньня закону і падпарадкоўваюць толькі асабістай волі А. Р. Лукашэнкі, ёсьць актам грубага выкарыстаньня ўлады ў асабістых інтарэсах і перавышэньня службовых паўнамоцтваў. ( арт. 426 Крымінальнага Кодэксу Рэспублікі Беларусь).

_____________ 2019 год, г. Менск

Подпісы